Известия Гомельского государственного университета
имени Ф. Скорины, № 1(82), 2013

*УДК 821.161.3*

# Мізантропія як крыніца натхнення ў творчасці Ю. Станкевіча

Г.М. Кісліцына

Артыкул прысвечаны аналізу творчасці Ю. Станкевіча. Даследуецца спецыфіка аўтарскага гуманізму, які аказаў уплыў на творчую манеру пісьменніка. На падставе разгляду прозы Станкевіча робіцца выснова пра тое, што крыніцай творчай інспірацыі пісьменніка з'яўляецца мізантропія.
**Ключавыя словы:** вобраз чалавека, сучаснік, лайдацтва, постмадэрнізм, нуда, аўтар, гуманізм, паліткарэктнасць.

The article is devoted to the analysis of creativity of Yu Stankevich. The author of the article investigates the specifics of Yu Stankevich's humanism, which had an impact on the features of the creative manner of the writer. On the basis of consideration of the prose of Stankevich it is possible to conclude that the source of the creative inspiration of the writer is misanthropy.
**Keywords**: image of a man, a contemporary, laziness, postmodernism, boredom, humanism, political correctness.

На пачатку 2013 года ў інтэрв'ю газеце «Звязда» вядомы пісьменнік Юры Станкевіч зазначыў са скрухай: «Расчараванне ў большасці людзей, альбо ва ўсіх, як у Славаміра Мрожэка, – вельмі моцнае негатыўнае пачуццё, тым больш калі бачыш, як у іх, нібы ў падвопытных пацукоў, увесь час толькі і выяўляецца неадольная прага да «кнопкі задавальненняў» [1, с. 5].

Гэтая заўвага – ключ да разумення творчасці неадназначнага, але яркага і самабытнага пісьменніка. Яна – напамін пра тое, што крыніцай творчай інспірацыі можа быць не толькі ідэальнае, светлае, высокае пачуццё, але і негатыўнае, у прыватнасці, мізантрапія як увасабленне зняверанасці ў чалавеку.

Як вядома, беларуская савецкая літаратура прадстаўляла практычна толькі адзін тып чалавека – «чалавек савецкі». Бескампрамісны барацьбіт за светлыя ідэалы чалавецтва, які існаваў хутчэй ва ўяўленні літаратуразнаўцаў, чым у саміх пісьменнікаў. Вобраз чалавека ў сённяшняй літаратуры выглядае больш разнастайным. Нават павярхоўны аналіз тэкстаў прыводзіць да высновы пра колькаснае павелічэнне персанажаў адмоўных, больш таго, назіраецца пэўная дыспрапорцыя на карысць апошніх. Усё часцей сучаснік малюецца пісьменнікамі ў сатырычным святле, аднак гэта тычыцца не толькі нашых суайчыннікаў, але і прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей.

Усё часцей і часцей нашы майстры слова падымаюць праблему непаразумення, якое нарастае паміж аўтарам – як прадстаўніком інтэлігенцыі з пэўным наборам духоўна-эстэтычных каштоўнасцей і палітычных перакананняў – і яго ўласным народам, якія ці не з кожным крокам аддаляюцца адзін ад аднаго. Сённяшнія мастацкія тэксты дэманструюць адсутнасць высокіх ідэй і памкненняў, і не столькі ў іх саміх, колькі ў грамадстве, якое з кожным годам усё болей выяўляе сябе як спажывецкае.

Нават культура сённяшнім абывацелем успрымаецца ў першую чаргу як культура забавы. У многім гэта і зразумела: дзякуючы несупыннай мадэрнізацыі і камп'ютарызацыі сучасны чалавек вызваліўся ад цяжкай манатоннай працы, атрымаў шмат вольнага часу. Але ці пайшоў ён на карысць чалавеку?

Сусветная літаратура і раней звярталася да праблемы **нуды**: дастаткова згадаць рускую літаратуру XIX ст. Аднак да нядаўняга часу яна заставалася праблемай людзей пэўнай сацыяльнай праслойкі, сёння ж на ролю анегіных, пячорыных і чацкіх прэтэндуюць людзі, якія ні выхаваннем, ні сацыяльным паходжаннем не павінны былі яе датыкнуцца, хаця б таму, што нудзіцца ў іх не было часу.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ ФРАНЦИСКА СКОРИНЫ

Відавочнае пераразмеркаванне часу, адведзенага на адпачынак і працу, у тым ліку і пераразмеркаванне, выкліканае беспрацоўем, якое несупынна расце ва ўсім свеце, прымусіла і філасафаў выказацца на гэты конт. Цікава, што некаторыя з іх ацэньваюць гэтую з'яву пазітыўна, бо бачаць у ёй шанец для стварэння новай формы чалавечага існавання. Праца не з'яўляецца, як сцвярджаюць прыхільнікі гэтага тэзісу, асяродкам, які надае сэнс чалавечаму існаванню і які служыць сродкам самарэалізацыі чалавека, як гэта сцвярджала філасофія Новага часу – ад Дэкарта і Лока, Гегеля і Маркса ажно да Макса Шэлера. Для філасафаў эпохі постмадэрну, праца быццам бы з'яўляецца пэўным спосабам адчужэння чалавека ад яго сутнасці, і вызваленне чалавека ад працы дасць шанец напоўніць сэнсам яго існаванне і самаздзейсніцца. Аднак ці адпавядае гэтая гіпотэза рэчаіснасці?

У кнізе Петэра Казлоўскі «Культура постмадэрну» ёсць цікавыя развагі на тэму ролі працы ў жыцці чалавека: « Несумненна тое, што практыка не можа быць адарваная ад працы і зразуметая як любы занятак у вольны час, ці хобі. Сувязь прафесіі і паклікання таксама павінна захоўваць сілу ў грамадстве, у якім губляе вастрыню праблема сутыкнення з прыродай; магчыма, менавіта такое грамадства здатнае зрабіць гэтую сувязь больш рэальнай для чалавека. Чалавек не выносіць стану бяздзейснасці. У сярэднявеччы, гультайства, acedia, успрымалася як загана, свайго роду хвароба, у прыватнасці як хвароба манаха альбо філосафа. Пазней побач са значэннем «бяздзейснасць» сталі выступаць такія значэнні, як смутак і меланхолія. Такая шматзначнасць тэрміна пралівае святло на нашу праблему» [4, с. 151]. Філосаф хрысціянскай арыентацыі прыходзіць да высновы прама супрацьлеглай аптымізму постмадэрністаў: «Свет без працы становіцца сумным, нудным, маркотным, бо гэты свет – свет, пазбаўлены перспектывы будучыні» [4, с. 151].

Такі сумны, нудны, маркотны свет узнікае на старонках твораў Юры Станкевіча, аднак у адрозненне ад постмадэрнісцкіх філасафаў-утапістаў пісьменнік апісвае рэальную сітуацыю сярэдзіны 1990-х гг., калі наша краіна ўвайшла ў вольную рыначную сістэму, а насельніцтва зноў, упершыню за многія дзесяцігоддзі, зведала, што такое беспрацоўе. Аднак, як выглядае з твораў Станкевіча, ні пра якое самаўдасканальванне вольны ад працы чалавек не дбае, больш за тое, менавіта беспрацоўе спрыяе яго імклівай дэградацыі – як духоўнай, так і фізічнай. П'янства, рабаўніцтва, крадзяжы, гвалт і забойства, на думку пісьменніка – гэта толькі знешнія праявы той навалы, якая пагражае чалавецтву, арыентаванаму на тое, каб набіць свой страўнік. Разважаючы над гэтай праблемай у аповесці «Прузі», Станкевіч стварае яскравы вобраз нашэсця саранчы, здатнай адно на тое, каб малаціць сківіцамі. І хоць аўтар апісвае як быццам рэальныя падзеі, яго метафара «людзі-саранча» застаецца празрыстай.

Лайдацтва – не проста адна з заганаў сучаснага чалавека, яно цягне за сабой больш страшныя правіны. Пошукі лёгкага хлеба вядуць карыслівых і жорсткіх герояў Станкевіча да татальнага абясцэньвання жыцця – і чужога, і свайго ўласнага. Старонкі яго кніг «Любіць ноч – права пацукоў», «Сатырыкон», «Мільярд удараў» поўняцца карцінамі гвалту, што чыняць людзі, для якіх усе сродкі паляпшэння матэрыяльнага дабрабыту добрыя, усе – акрамя працы.

Як заўважае Станкевіч, сёння лайдацтва закранула ўсе пласты насельніцтва. Стаўленне пісьменніка да гэтай з'явы раскрываецца ў аповесці «Рыфма». Ужо на пачатку твора аўтар выказвае свае адносіны да праблемы праз дыялог прадпрымальнікаў, якія ў новых эканамічных умовах спрабуюць наладзіць вытворчасць, укладаючы ў справу ўвесь свой час і сродкі:

*– Звычайны працэс. У метро які-небудзь шчыпач прагне залезці табе ў кішэню, а на працы – дык і хакеры ўжо з'явіліся. Да мяне днямі ў офіс нават паэт прасачыўся. Таксама па грошы. «Дайце, – кажа, – колькі не шкада, хачу зборнік вершаў выдаць».*

*– І ты даў? – спытаў Рыгор Вайтовіч.*

*– Я яму кажу – пакажы рукапіс. Ну, ён выцягнуў нейкія паперы. Я пачытаў – і ў сметнік. Дзярмо. Блажэнны нейкі.*

*– Чаму? Як ты вызначыў? Можа, ён геній, новы Хлебнікаў.*

*– Ха!*

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

*– Лайдакоў развялося – процьма, – паспачуваў ўжо Душко Ліцьвінка. – Заводы кладуцца адзін за другім. Пралетар разбэшчваецца: няма чаго рабіць. П'юць. Да швачак маіх падлабуньваюцца, ганяю іх... Лезуць усё роўна пад вокны* [2, с. 150].

Адзін з удзельнікаў гэтай гутаркі ўжо ў хуткім часе будзе забіты «інтэлігентнай» дзяўчынай, знаўцай літаратуры і філасофіі, якая палічыць, што чалавечыя жыцці (у аповесці яна здзяйсняе некалькі забойстваў) – невялікая плата за яе новае прыгожае і спакойнае жыццё. Апраўдваючы свой выбар, яна згадвае фантастычны свет «Машыны часу» Г. Уэлса, дзе грамадства дзеліцца на дзве часткі – морлакаў і элояў. Сэнс жыцця для яе просты – выбрацца ў вышэйшы свет, дзе можна «піць шампанскае з багемай» і «размаўляць пра жывапіс, літаратуру», «мець за спіной багатага мужа, элоя».

Калі Паліна, гераіня «Рыфмы», робіць свой выбар свядома, стаміўшыся ад непераадольнай беднасці, ад цяжкага жыцця з бацькамі-алкаголікамі, то «героі» іншых твораў Ю. Станкевіча часцяком і не задумваюцца над апраўданнем уласных нізкіх памкненнняў. Яны існуюць па прынцыпе «жыць, як набяжыць», іх жыццёвыя прыярытэты будуюцца вакол трыяды «грошы – секс – алкаголь». Заўважаецца, што адным з самых ужывальных слоў, якімі героі Станкевіча апісваюць свае жыццёвыя памкненні, з'яўляецца слова «кайф», пад якім разумеюць штучна прастымуляванае задавальненне, як правіла, з дапамогай алкаголю ці псіхатропных рэчываў. Пошук пастаяннага задавальнення становіцца звышмэтай сучасніка – папярэджвае ў сваіх творах пісьменнік.

У аповесці-папярэджанні «Эрыніі» Ю. Станкевіч стварае пераканаўчы вобраз **гома фэстывус**, чалавека, які ўжо няздатны працаваць. Вуснамі сваіх герояў, следчага Следака і старога філосафа Крэза, ён прыходзіць да той жа высновы, што і П. Казлоўскі, калі разважае пра значэнне працы ў кнізе «Культура постмадэрну».

*Але ж паслухайце, – раптам захваляваўся Слядак, – з вашых слоў вынікае, што будучыні ўвогуле няма?»*

*– Чаму ж няма? Яна ёсць: кароткая, абрыдная і тужлівая. Думаць трэба было яшчэ заўчора, а ўчора дзейнічаць. Замест гэтага стварылі бачнасць суцэльнага свята, выхавалі спачатку так званага гома фэстывус, дазволілі на глум сабе гомасексуальныя шлюбы, распладзілі хамаў, педэрастаў і садамітаў замест ваяроў, так што працэс незваротны. Пішыце завяшчанні. Як казаў старажытны філосаф, з вялікага лёсу нарадзілі мыш. Імя гэтай мышы – гома іноксіс, чалавек бесклапотны. У ім няма ні жорсткасці, ні волі да ўлады, ні моцы. Ён з'явіўся ўжо дзесяць гадоў назад, калі адбыліся генетычныя змены ў сексуальнай і інтэлектуальнай сферы, пачалі ўвогуле губляцца палавыя прыкметы, узнікла магчымасць кіруемай мабілізацыі рэсурсаў галаўнога мозгу, падключэння індывідуальнай памяці да рэсурсаў камп'ютэрных банкаў інфармацыі, уключаючы алгарытмы вырашэння задач творчага характару, праграміравання перакадзіроўкі сваёй асобы* [3, с. 46].

Нягледзячы на тое, што стылістычна яго проза відавочна атрыбутуецца як постмадэрнісцкая, Юры Станкевіч прынцыпова выступае супраць таго, што разумеецца пад каштоўнасцямі эпохі постмадэрну. Пасля выхаду ў свет яго кнігі «Любіць ноч – права пацукоў» ён быў літаральна ўтаўраваны словам «расіст», што, праўда, не адбілася на чытацкай увазе. І гэта зразумела: ён ці не адзіны з беларускіх пісьменнікаў, які ў цяперашні гульліва-іранічны час здатны адкрыта прызнацца ў тым, што ён заклапочаны такімі «прагрэсіўнымі» з'явамі, як жаночая эмансіпацыя, гіпертрафаваная цікавасць мас-медыя да рознага роду фрыкаў, страта нацыянальнай ідэнтыфікацыі. На жаль, сёння выяўленне глыбокіх пачуццяў, не звязаных з асабістым жыццём, часцяком успрымаецца як парушэнне канвенцыі. Таму Ю. Станкевіч для многіх – блазан, юродзівы, пра якіх ён так часта піша… Яго маральныя імператывы неяк прынцыпова не супадаюць з тым, сёння разумеецца пад паняццем «еўрапейскія каштоўнасці». Але якімі сродкамі дасягнуць ідэальнага «заўтра»? Абмежаваннем міграцыі, забаронай змешаных шлюбаў, лабатаміяй вычварэнцаў? Гэтыя «выратавальныя» ідэі ўжо выказваліся ў параўнальна нядаўняй гісторыі і скончыліся, як вядома, разам з Другой сусветнай вайной, якая, па сутнасці, даказала неабходнасць выпрацоўкі новых каштоўнасцей, якраз тых самых постмадэрнісцкіх каштоўнасцей, супраць якіх і паўстае ўвесь час Юры Станкевіч.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ ФРАНЦИСКА СКОРИНЫ

Твор за творам станоўчымі героямі Станкевіча становяцца персанажы, якіх умоўна можна акрэсліць як «чысцільшчыкаў грамадства». У аповесці «Любіць ноч – права пацукоў» гэта Даніла Прусак, у аповесці «Эрыніі» – следчы Слядак. І першы і другі – героі-адзіночкі, якія вядуць самастойнае раскрыццё забойстваў. Аднак відавочна, што дэтэктыўны сюжэт – толькі знешняя канва аповедаў: у першую чаргу аўтара цікавіць праблема духоўнага забойства Чалавека ў сучасным свеце, праблема, да якой Станкевіч падыходзіць як да гуманістычнага расследавання.

Крок за крокам, версія за версіяй пісьменнік выкладае свой погляд на праблему сённяшняй дэгуманізацыі чалавецтва досыць паслядоўна і аргументавана. Як правіла, гэтыя меркаванні, сярод якіх ёсць і пераказы вядомых навуковых тэорый, і ўласна аўтарскія меркаванні, укладваюцца ў вусны старых інтэлігентаў: у аповесці «Любіць ноч – права пацукоў» гэта дзед з «гаворачым» іменем Антон Кніга, у «Эрыніі» – стары Крэз, мянушка якога ў кантэксце твора можа быць расшыфраваная як «багаты ведамі».

Сёння цяжка ацаніць, наколькі змрочныя прагнозы пісьменніка могуць адпавядаць магчымаму развіццю падзей. Аднак бачна, што погляд Ю. Станкевіча на свет і будучыню чалавека вылучаецца выяўным **песімізмам**, хоць ён і неаднаразова падкрэслівае думку, што рэчаіснасць – усяго толькі адна з праяў Сімуляцыі, а значыць і будучыня мала залежыць ад жадання яе змяніць. Між тым, свет, прадстаўлены на старонках яго твораў, заслугоўвае ўважлівага разгляду ўжо хаця б таму, што гэты гранічна завостраны, гратэскны вобраз нагадвае Беларусь. Праўда, некаторыя праблемы, якія падымаюцца пісьменнікам, такія, як прастытуцыя, рост злачыннасці, алкагалізацыя і наркатызацыя насельніцтва, найбольшую актуальнасць мелі ў 90-х г. мінулага стагоддзя, але і цяпер некаторыя з іх, напрыклад, незаконная масавая міграцыя, застаюцца вельмі вострымі для сучаснага беларускага грамадства.

Сучасная беларуская літаратура быццам бы пазбягае любога заглыблення ў фундаментальныя праблемы сённяшняга свету, пакідаючы за сабой толькі адну функцыю – забаўляльную. Рэдкім выключэннем выглядае проза Ю. Станкевіча. Аднак аналіз яго твораў прыводзіць да парадаксальнай высновы пра тое, што рухае пісьменнікам не столькі любоў да чалавека, колькі нянавісць да сучасніка, няздатнага задумацца над уласным лёсам.

**Літаратура**.

1. Станкевіч, Ю. «Роля пісьменніка – спыніць маральнае падзенне чалавека» [З Ю. Станкевічам гутарыць Л. Ракоўская] / Звязда. – 2013. – 5 жніўня.
2. Станкевіч, Ю. Любіць ноч – права пацукоў / Ю. Станкевіч. – Мінск : Маст. літ., 2000. – 332 с.
3. Станкевіч, Ю. Мільярд удараў / Ю. Станкевіч. – Мінск : Галіяфы, 2008. – 324 с.
4. Козловски, П. Культура постмодерна: общественно-культурные последствия технического развития / П. Козловски. – М. : Республика, 1997. – 240 с.

Центр исследований белорусской культуры,
языка и литературы НАН Беларуси
Поступила в редакцию 09.12.2013

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ